http://www.etnolog.org.ua

# ВЫВУЧЭННЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ БЕЛАРУСАЎ У СЯРЭДЗІНЕ XIX – НА ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ *

**Галіна Каспяровіч**

**УДК 636(476)“185/201”**

У артыкуле аналізуюцца этналагічныя публікацыі сярэдзіны XIX – пачатку XXI ст. па традыцыях жывёлагадоўлі беларусаў, вылучаныя этапы развіцця навуковай думкі па праблеме, акрэслены новыя напрамкі ў вывучэнні жывёлагадоўлі.

**Ключавыя словы:** жывёлагадоўля, аграрная вытворчасць, традыцыі, гісторыяграфічны аналіз, этналогія.

В статье анализируются этнологические публикации середины XIX – начала XXI в. о традициях животноводства белорусов, выделены этапы развития научной мысли по проблеме, очерчены новые направления в изучении животноводства.

**Ключевые слова:** животноводство, аграрное производство, традиции, историографический анализ, этнология.

The article analyses the ethnological publications of the mid-XIXth – early XXIst centuries on the traditions of cattle breeding in Belarus, describes the stages of the scientific thought development on this issue, shows the modern tendencies in studying cattle breeding.

**Keywords:** cattle breeding, agricultural sector, traditions, historiographical analysis.

Вывучэнне аднаго з надзвычай важных заняткаў беларусаў – жывёлагадоўлі належыць да ліку прыярытэтных праблем у этналагічнай навуцы. Карані жывёлагадоўчай культуры беларускага народа сягаюць у глыбокую старажытнасць. Аб'ектыўнае асэнсаванне гістарычных шляхоў станаўлення і развіцця культурных комплексаў галіны неабходна для правядзення ствральнай аграрнай палітыкі, якая дазволіць улічыць вопыт, працоўныя дасягненні і пазбегнуць памылак мінулага. Аналіз гістарыяграфічных крыніц дапаможа выявіць становішча, ступень навуковага вывучэння праблемы і перспектыўныя накірункі далейшых даследаванняў.

Між тым гэтая праблема даследавана недастаткова. Шмат якія яе аспекты не прааналізаваны. Да сённяшняга часу жывёлагадоўчая вытворчая культура беларусаў этнаграфічнай навукай як спецыяльная праблема не вывучалася. Адсутнічаюць абагульняючыя працы, у якіх на шырокіх фактычных матэрыялах, у гістарычнай дынаміцы, з выкарыстаннем даных сумежных навук (археалогіі, гісторыі, лінгвістыкі, фалькларыстыкі, статыстыкі, сацыялогіі, эканомікі, геаграфіі) даследавалася б культура жывёлагадоўлі.

У развіцці навуковай думкі па праблеме можна вылучыць тры этапы. Першы ахоплівае сярэдзіну XIX – пачатак XX ст. У гэты час сіламі вандроўнікаў-краязнаўцаў, этнографаў не толькі назапашваўся ўнікальны фактычны матэрыял па тэме, але і рабіліся спробы многафактарнага, комплекснага аналізу жывёлагадоўлі. Характэрна, што працы не страцілі сваёй актуальнасці і для наступных пакаленняў даследчыкаў, паслужылі свайго рода базай для параўнальна-гістарычнага аналізу традыцый жывёлагадоўлі.

Вывучэнне жывёлагадоўлі Беларусі пачалося яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Пэўныя звесткі па пытаннях жывёлагадоўлі друкаваліся ў штогадовых перыядычных выданнях «Памятная книжка Виленской губернии», «Памятная книжка Минской губернии», «Памятная книжка Гродненской губернии», «Памятная книжка Могилёвской губернии», «Вестник Минского губернского земства», «Сельскохозяйственная жизнь. Витебск», «Ветеринарная хроника Ви-

* Артыкул падрыхтаваны ў межах распрацоўкі тэмы «Этнокультурное наследие народов Украины и Беларуси в контексте современного социокультурного дискурса» Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў, дагавор № Г16К-029 ад 21 кастрычніка 2016 г.

http://www.etnolog.org.ua



тебской губернии», «Обзор Гродненской губернии 1880–1914 гг.», часопіс «Сельский хозяин» і інш. У асобных артыкулах паказана дынаміка колькасці асноўных відаў свойскіх жывёл, ахарактарызаваны метады і спосабы іх гадавання, пароды, кармавытворчасць.

Невялікія па аб'ёму нататкі і цікавыя замалёўкі гадавання свойскай жывёлы пакінуў этнограф, краязнаўца П. Шпілеўскі [28].

З сярэдзіны XIX – пачатку XX ст. з'явіліся этнаграфічныя працы, у якіх побач з эканамічна-гаспадарчай дзейнасцю беларусаў звернута ўвага на культуру жывёлагадоўлі. У другой палове XIX ст. былі апублікаваны шматтомныя матэрыялы, сабраныя афіцэрамі генеральнага штаба, у тым ліку і па заходніх губернях: П. Баброўскім па Гродзенскай [2], А. Корава па Віленскай [1], І. Зеленскім па Мінскай [9]. У гэтых выданнях змяшчаюцца каштоўныя матэрыялы па аграрнай вытворчасці беларусаў, у тым ліку і па жывёлагадоўлі. На падставе літаратурных, архіўных, статыстычных крыніц, уласных даследаванняў аўтары прааналізавалі становішча асноўных галін жывёлагадоўлі, фактары іх структурных змен. У працах дадзена характарыстыка лугаводства, промыслаў і рамёстваў, звязаных з гужавым транспартам, стана шляхоў зносін.

Грунтоўны трохтомнік «Опыт описания Могилевской губернии...» (1882–1884) падрыхтаваны і выдадзены пад рэдакцыяй старшыні Магілёўскага статыстычнага камітэта А. Дамбавецкага [15]. У другой кнізе прадстаўлены багаты матэрыял па жывёлагадоўлі, выяўлены фактары, якія ўплываюць на яе становішча, паказаны асаблівасці ўтрымання, догляду, развядзення і прадукцыйнасці буйнай рагатай жывёлы і коней, звернута ўвага на хваробы жывёлы, выяўлена дынаміка эпізаотый, змешчаны звесткі па рыбалоўству, спосабах лову і прыладах працы, пчалярству, лугавых угоддзях і травасеянні. Матэрыялы, змешчаныя ў кнізе, падмацаваны шматлікімі статыстычнымі дадзенымі.

Значны ўклад ў даследаванне матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў Віцебшчыны XIX ст. унес М. Нікіфароўскі. У кнізе «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии...» [14], у яе асобных раздзелах «В хлеву», «В возовне», «Сбруя и упряжь», «На покосе», «У пчалінцу», «На рыболовле» вобразна прадстаўлены каштоўныя этнаграфічныя матэрыялы аб гадаванні буйнай рагатай жывёлы, коней, авечак, свіней у сялянскай гаспадарцы, вырабе летніх і зімніх сродкаў транспарта, збруі і іх выкарыстанні, нарыхтоўцы сена, пчалярстве і рыбалоўстве. У цеснай сувязі з пазначанай кнігай, у дапаўненне да яе М. Я. Нікіфароўскі друкуе зборнік «Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах» (Витебск, 1897), у якім змешчаны прыкметы і павер'і, прысвечаныя жывёле і птушкам, характарызуюцца хваробы і лячэнне жывёлы.

Асобныя звесткі аб гадаванні свойскай жывёлы, надворных пабудовах, пастушаскіх традыцыях, святкаванні першага выгана жывёлы на пашу, яе лячэнні, уяўленнях беларусаў аб чараўніках і малочных ведзьмах змешчаны ў трэцім томе П. Шэйна [27].

Каштоўныя звесткі аб свойскіх жывёлах, гаспадарчых пабудовах, сухапутных сродках транспарта, лоўлі рыбы, ракаў і рыбалоўных снасцях, спосабах развядзення пчол і пчалярскім інвентары дае Е. Раманаў [16].

Цікавы практычны вопыт гадавання свойскай жывёлы і птушкі і карысныя парады да іх лепшага ўтрымання падае Г. Цюндзявіцкая ў кнізе «Літоўская гаспадыня» (кніга выйшла з друку ў сярэдзіне XIX ст. і перадрукавана ў канцы XX ст.) (Мінск, 1993).

Асобныя матэрыялы аб стане жывёлагадоўлі ў лакальных рэгіёнах Палесся падае І. Сербаў у кароткім этнаграфічным нарысе «Беларусы-сакуны» [19]. Больш шырока прадстаўлена жывёлагадоўля ў кнізе І. Сербава «Вічынскія паляне» [18], дзе аўтар звяртае ўвагу на звычаі, абрады, замовы, ахоўныя дзеянні са свойскай жывёлай, апісвае гужавы транспарт, вупраж, пабудовы для жывёлы і прылады працы.

Невялікі па памерах, але інфармацыйна ёмісты раздзел па жывёлагадоўлі змясціў

http://www.etnolog.org.ua



М. Доўнар-Запольскі ў кнізе «Народное хозяйство Белоруссии» (Мінск, 1926), дзе на разнастайных статыстычных матэрыялах выяўлена дынаміка асноўных галін жывёлагадоўлі сярэдзіны XIX — пачатку XX ст. Аўтар прадбачыў перспектывы развіцця другой важнейшай галіны аграрнай гаспадаркі: «Такая страна, как Белоруссия, где скудность почвы требует больших затрат капитала, товарное скотоводство должно бы составлять главнейшую задачу сельского хозяйства» [4, с. 125].

Каштоўнай з'яўляецца навуковая спадчына даследчыкаў міфалогіі (А. Афанасьеў, В. Клінгер, М. Мюллер, Э. Тэйлар і інш.). В. Клінгер, даследуючы значэнне жывёл у міфалагічнай карціне народаў свету, адзначае: «современные поверья, обряды и суеверные приемы, в которых ту или иную роль играют животные, принадлежат к числу древнейших документов человеческой мысли <..> и потому имеют для мифологии и этнологии чрезвычайно важное значение» [6, с. 2–3].

У працах даследчыкаў XIX — пачатку XX ст., прысвечаных менавіта лакальна-рэгіянальным, а таксама асобным пытанням жывёлагадоўлі Беларусі, адлюстраваны значны этап вывучэння дадзенай праблемы. У іх паказаны асаблівасці галіны, параўнальна высокая культура гадавання свойскай жывёлы, яе важнае месца ў сістэме жыццязабеспячэння беларускага народа.

Другі этап даследаванняў ахоплівае 1920–1980-ыя гг. У гэты час вывучаліся галоўным чынам матэрыяльныя аспекты жывёлагадоўлі і меншая ўвага надавалася бясцэнным артэфактам сацыяльнай і духоўнай культуры, у якіх быў сканцэнтраваны вопыт, народныя веды, навыкі, звычаі, абрады, стэрэатыпы паводзін беларусаў. Яны набывалі ідэалагічнае адценне і ацэньваліся як перажыткі мінулага.

У вывучэнне традыцый жывёлагадоўлі беларусаў-палешукоў значны ўклад унеслі Ч. Пяткевіч, К. Машынскі, працы якіх выйшлі за межамі БССР. У грунтоўнай манаграфіі Ч. Пяткевіча «Рэчыцкае Палессе» (Кракаў, 1928) асобныя раздзелы прысвечаны заняткам, звязаным з пастухоўствам і гадоўляй жывёлы, бортніцтвам, лячэннем жывёлы, рамёствамі (стальмахоўства, калёсніцтва, кавальства). К. Машынскі ў працы «Усходняе Палессе» (Варшава, 1928) скрупулёзна даследуе пастухоўства і жывёлагадоўлю (спосабы ўтрымання жывёлы, даенне кароў, адкорм, нарыхтоўку сена), выяўляе асаблівасці рыбалоўства і пчалярства Мазырскага Палесся.

Асвятленню стану жывёлагадоўлі ў гады калектывізацыі прысвечаны артыкулы ў часопісе «Наш край» М. Грынблата [3], Т. Кулакова, М. Валатоўскага [8], М. Самцэвіч [17].

У 1933 г. выйшла з друку змястоўная праца М. Нікольскага «Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства» (Мінск, 1933), у якой аналізуецца каштоўны матэрыял аб культах жывёл.

Вывучэнне жывёлагадоўлі было прыпынена ў 1940–1950-я гг., што звязана са складанасцямі калектывізацыі і цяжкімі выпрабаваннямі ў Вялікую Айчынную вайну, і аднаваліся ў канцы 1950-х гг. са стварэннем Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Абагульняючая характарыстыка сялянскай жывёлагадоўлі XIX — пачатку XX ст. змешчана ў змястоўнай працы Л. А. Малчанавай «Материальная культура белорусов» (Минск, 1968). Аўтар паказвае значэнне галіны, дае кароткую характарыстыку яе структуры, звяртае ўвагу на спецыфіку кармлення свойскай жывёлы, асаблівасці інвентару для нарыхтоўкі сена.

Вынікам вывучэння гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Палесся беларускімі і ўкраінскімі этнолагамі з'явілася манаграфія «Полесье. Материальная культура» (Киев, 1988), у якой ёсць раздзел «Животноводство» Л. А. Малчанавай і Р. І. Федына. Аўтары выявілі асаблівасці жывёлагадоўчай культуры рэгіёна, паказалі яе змены на працягу XIX–XX стст. Шляхам зносін і сродкам транспарта прысвечаны раздзел гэтай кнігі, падрыхтаваны В. Цітовым і А. Шляхтоўскім.

У 1991–2017 гг. са зменамі палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь у этналагічнай навуцы ажыццяўляецца зварот даследчыкаў да комплекснага сістэмнага

http://www.etnolog.org.ua



аналізу традыцый жывёлагадоўлі, выкарыстання напрацаваных матэрыялаў і метадаў сумежных дысцыплін — фалькларыстыкі, этналінгвістыкі, археалогіі, гісторыі, статыстыкі і інш.

Шырокае кола пытанняў культуры жывёлагадоўлі даследуецца ў працах В. Цітова [10; 20; 23–25]. Характарызуючы структуру жывёлагадоўлі, аўтар выяўляе яе рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці, прасочвае ўзаемасувязі з земляробствам, у асабістасці з нарыхтоўкай кармоў, змястоўна аналізуе рамесныя заняткі, якія спадарожнічаюць галіне, сродкі гужавага транспарта і вупраж. Працы тычацца ў асноўным храналагічнага перыяду XIX — пачатку XX ст.

У пачатку XXI ст. выйшла з друку арыгінальнае багата ілюстраванае шматтомнае выданне «Нарысы гісторыі культуры Беларусі», пад навуковай рэдакцыяй А. Лакоткі. У першым томе пазначанага выдання даследуюцца разнастайныя аспекты матэрыяльнай культуры сацыяльнай эліты [11]. Г. Каспяровіч выяўляе тэндэнцыі, фактары і праблемы эвалюцыі асноўных галін жывёлагадоўлі ў маёнтках, С. Мілючэнкаў, характарызуючы магнацкія і шляхецкія маёнткі, звяртае ўвагу на сельскагаспадарчыя пабудовы для свойскіх жывёл, С. Захаркевіч даследуе сродкі перамяшчэння, у тым ліку гужавы транспарт. Трэці том нарысаў, менавіта яго першая кніга [12], прысвечаны матэрыяльнай культуры беларускага сяла. У шэрагу важных пытанняў даследуецца жывёлагадоўля сялян, сельскагаспадарчая адукацыя (Г. Каспяровіч), традыцыйныя рамёствы і промыслы, звязаныя з гадаваннем свойскай жывёлы (Я. Сахута), транспартныя сродкі (С. Захаркевіч). У другой кнізе трэцяга тома нарысаў [13] змешчаны раздзел Л. Сівуравай «Свойская жывёла: міфалогія, звычаі і абрады», у якім характарызуюцца светапоглядныя ўяўленні беларусаў аб хатніх жывёлах. У гэтай жа кнізе апублікаваны раздзел А. Бабіч «Пчалярства ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў».

У гістарыяграфіі, прысвечанай вераванням, абрадам, звязаным з жывёлагадоўляй, важнымі працамі з'яўляюцца: «Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі» (Мінск, 1990), «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (у 6 тамах, Т. Б. Варфаламеева [і інш.]) (Мінск, 2001–2013), К. Шумскі «Традыцыйныя веды беларусаў аб раслінные свеце і надвор'і (XIX — пачатак XXI ст.) і іх экалагічная значнасць» (Мінск, 2009), «Міфалогія беларусаў: энц. слоўнік» (Мінск, 2011), «Беларускі фальклор: энцыклапедыя» (у 2 тамах) (Мінск, 2005, 2006).

Вялікую каштоўнасць маюць фальклорныя матэрыялы. Каляндарны і сямейны цыклы народных песень, казкі, прыказкі і прымаўкі змяшчаюць багацейшую этнаграфічную інфармацыю.

Вывучэннем развіцця жывёлагадоўлі Беларусі займаліся таксама гісторыкі В. Чапко [26], П. Казлоўскі [7], М. Улашчык [21; 22], археолагі Т. Каробушкіна [5, с. 247–248], В. Шчаглова [30], П. Лысенка [29].

Самую вялікую частку літаратуры складаюць кнігі, брашуры, артыкулы сельскагаспадарчага накірунку, менавіта па жывёлагадоўлі. У іх асвятляюцца пытанні развядзення, кармлення і ўтрымання сельскагаспадарчых жывёл, механізацыі і электрафікацыі працаёмкіх працэсаў на фермах, перспектывы спецыялізацыі і размяшчэння вытворчасці, актуальныя праблемы павышэння прадукцыйнасці сельскагаспадарчых жывёл.

Ва ўмовах інтэнсіўнай глабалізацыі і мадэрнізацыі беларускага грамадства востра паўстае пытанне аб захаванні багатай і самабытнай культурнай спадчыны. У гэтай сувязі неабходна выявіць механізмы захавання традыцый народнай культуры ў яе лакальных варыянтах, іх адаптацыю і трансфармацыю як у калектыўных, так і ў асабістых сялянскіх і фермерскіх гаспадарках Беларусі.

1. Виленская губерния / составил Генерального штаба капитан А. К. Корева. – Санкт-Петербург : в Тип. Огризко, 1861. – 804 с.

2. Гродненская губерния / составил член Имп. рус. геогр. об-ва Генерального штаба подполковник П. Бобровский // Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба : в 2 ч. – Санкт-Петербург : в Тип. Департамента Генерального штаба, 1863. – Ч. 2. – 1074 с.

http://www.etnolog.org.ua




3. *Грынблат М. Я.* Некаторыя матэрыялы да вывучэння пастушаства і жывёлагадоўлі. Тураўшчына / М. Я. Грынблат // Наш край. – 1928. – № 8/9. – С. 65–71.

4. *Довнор-Запольский М. В.* Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 / М. В. Довнор-Запольский. – Минск: изд-во госплана БССР, 1926. – 239 с.

5. *Каробушкіна Т.* Сельская гаспадарка ў X–XIII стст. / Т. Каробушкіна // Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь. Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Экоперспектыва. – 2000. – 351 с.

6. *Клингер В.* Животное в античном и современном суеверии. – Киев : Тип. Импер. университета св. Владимира, Акц. об-во печ. и издат. дела Н. Т. Корчак-Новицкого, Мерингов, 1911. – 352 с.

7. *Козловский П. Г.* Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII в. – Минск : Наука и техника, 1974. – 180 с.

8. *Кулакоў Т. П., Валатоўскі М. С.* Крукавіцкі сельсавет Азарыцкага раёну Мазырскае акругі / Т. П. Кулакоў, М. С. Валатоўскі // Наш край. – 1929. – № 11. – С. 25–26.

9. Минская губерния / составил И. И. Зеленский // Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба : в 2 ч. – Санкт-Петербург : в Военной типографии, 1864. – Ч. 1. – 672 с.

10. Народная культура Беларусі : Энцыкл. даведнік / пад агул. рэд. В. С. Цітова. – Мінск : Бел. энцыкл. – 2002. – 432 с.

11. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 1. Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. / А. І. Лакотка [і інш]; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – 575 с.

12. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. Кн. 1. Матэрыяльная культура / А. І. Лакотка [і інш] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 567 с.

13. Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 3. Кн. 2. Духоўная культура / А. І. Лакотка. [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2016.

14. *Никифоровский Н. Я.* Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. тип., 1895. – VIII. – 552 с.

15. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношении / составлен по программе [с предисл.] и под ред. А. С. Дембовецкого : в 3 кн. – Могилев на Днепре : Тип. губернского правления, 1882–1884. – Кн. 2. – 1000 с.

16. *Романов Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – 600 с.

17. *Самцэвіч М.* Да вывучэння калгасаў. Кароткая праграма даследавання калгасаў / М. Самцэвіч // Наш край. – 1929. – № 12. – С. 8.

18. *Сербаў І. А.* Вічынскія паляне : Этнаграфічны нарыс па матэрыяльнай культуры Беларускага Палесся. – Мінск : Інбелкульт, 1928. – 52 с.

19. *Сербов И. А.* Белорусы-сакуны: Краткий этнографический очерк / И. А. Сербов. – Петроград : Тип. Имп. акад. наук, 1915. – 180 с.

20. *Титов В. С.* Животноводство / В. С. Титов // Белорусы. – Москва : Наука, 1998. – С. 154–161.

21. *Улашчык М.* Была такая вёска. Гісторыка-этнаграфічны нарыс. – Мінск, 1989. – 172 с.

22. *Улащик М.* Деревня Вицковщина. 1880–1917 гг. Историко-этнографический очерк. – Москва : ИМЛИ, 2003. – 192 с.

23. *Цітоў В. С.* Гужавы транспарт // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 161.

24. *Цітоў В. С.* Жывёлагадоўля // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 197.

25. *Цітоў В. С.* Народная спадчына : Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

26. *Чепко В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века / В. В. Чепко. – Минск : Наука и техника, 1966. – 213 с.

27. *Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / П. В. Шейн. – Санкт-Петербург : Тип. Имп. акад. наук, 1902. – Т. 3 : Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени; игры, верования, обычное право, чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, суеверья, приметы. – 596 с.

28. *Шпилевский П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / предисл. текстол., прим. и комент. С. А. Кузнецовой. – Минск : Беларусь, 2004. – 250 с.

29. *Шчаглова В. В., Лысенка П. Ф.* Да гісторыі жывёлагадоўлі і палявання ў старажытным Пінску / В. В. Шчаглова, П. Ф. Лысенка // Весці АН БССР. – 1977. – № 4. – (Серыя грамадскіх навук). – С. 79–83.

30. *Щеглова В. В.* К вопросу о животноводстве в Белоруссии в средние века / В. В. Щеглова // Древности Белоруссии. Доклады к конференции по археологии Белоруссии / под ред. В. Д. Будько, П. Ф. Лысенко, Л. Д. Поболя, М. М. Чернявского. – Минск, 1969. – С. 406–426.